# Акцыя "Слова пра жанчыну"

У выдатнай жанчыны, маці і нашага сацыяльнага работніка Дзеравянкінай Галіны Казіміраўны 14 кастрычніка двайное свята, акрамя таго, што ў гэты дзень святкуецца Дзень маці гэта яшчэ і дзень яе нараджэння. Спецыялісты аддзялення сацыяльнай дапамогі дома ДУ "Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна" сумесна са старшынёй Жупранскага сельвыканкама сустрэліся і павіншавалі яе з гэтымі святамі. Шмат добрых і цёплых слоў гучала ў гэты дзень у адрас Галіны Казіміраўны.

Акрамя таго, што Галіна Казіміраўна - выдатная маці, якая выхавала 2 дзяцей, яна на працягу 30 гадоў клапоціцца аб пажылых грамадзянах аг.Станцыя Ашмяны і прылеглых вёсак, актыўна ўдзельнічае ў жыцці сельвыканкама. За час працы ўзнагароджвалася граматамі камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама і ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Ашмянскага райвыканкама. У 2007 годзе занесена на раённую Дошку гонару.



